## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МЕНШАСЦІ У БЕЛАРУСІ Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ МІЖВАЕННАГА ПЕРЫЯДУ: ПРАБЛЕМЫ ТЭРМІНАЛОГІІ

*Дз.А. Крэнт*
*Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

Ва ўмовах сканчэння Першай сусветнай вайны, рэвалюцыйных падзей і афармлення беларускай дзяржаўнасці, значная увага пачала надавацца вывучэнню не толькі тытульнага насельніцтва Беларусі, але і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Адной з важных праблем, якая паўстала перад навукоўцамі, тэарэтыкамі і практыкамі нацыянальнага будаўніцтва, з'яўляўся пошук і выкарыстанне новых тэрміналагічных канструкцый, якія б адпавядалі рэаліям часу і садзейнічалі аб'ектыўнаму асэнсаванню нацыянальнай разнастайнасці насельніцтва краіны.

Мэтай дадзенай работы з'яўляецца прааналізаваць змены ў тэрміналагічным апараце даследаванняў міжваеннага перыяду прысвечаных нацыянальным меншасцям у Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання сталі навуковыя і публіцыстычныя працы міжваеннага перыяду ў якіх атрымалі асвятленне праблемы гісторыі і сучаснага становішча шэрагу нацыянальных меншасцей Беларусі. Пры напісанні работы выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз), так і ўласнагістарычныя метады даследавання (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У паслярэвалюцыйнай навуковай думцы і публіцыстыцы Беларусі амаль не згадваецца замацаваны ў расійскай імперскай традыцыі тэрмін ў дачыненні да іншанацыянальнага насельніцтва – "іншародцы". Адзіным прыкладам яго выкарыстання ў беларускім друку стаў артыкул "Инородческая школа прежде и теперь" (1919 г.) [1]. Варта спыніцца на недасканаласці і сэнсавай абмежаванасці згаданага тэрміна. З аднаго боку, у прававой і навуковай практыцы ён ужываўся ў дачыненні да прадстаўнікоў усходніх нацыянальнасцей і яўрэяў. Толькі на пабытавым ўзроўні ён атаясамляўся з еўрапейскімі народамі, якія пражывалі на абшарах Расійскай імперыі. З іншага боку, памянёны тэрмін быў цесна звязаны з канцэпцыяй "трыадзінага рускага народа". Ва ўмовах афармлення беларускай дзяржаўнасці, прызнання факту існавання самастойнай беларускай нацыі, дадзеная сэнсавая абмежаванасць не адпавядала патрабаванням часу. У сувязі з апошнім, у артыкуле дадзена новае тлумачэнне "іншародцам", больш шырокае ў параўнанні з дарэвалюцыйным перыядам – "грамадзяне Рэспублікі, якія размаўляюць не на рускай мове" [Цыт. па: 1, с. 12]. Акрамя таго, складальнік працы ў якасці сіноніма дадзенага тэрміна выкарыстоўваў словазлучэнне "нацыянальная меншасць". Ужыванне памянёнай лексічнай канструкцыі з'яўлялася больш спрыяльным у тым плане, што яна не мела ідавочнай повязі з расійскай дарэвалюцыйнай публіцыстычнай і навуковай традыцыяй.

Значную ролю для замацавання тэрміна "нацыянальная меншасць" ў беларускай навуковай думцы прыклаў грамадскі дзеяч і географ А. Смоліч. У падручніку "Геаграфія Беларусі" (першае выданне 1919 г.) даследчыкам быў вылучаны асобны параграф, прысвечаны нацыянальным меншасцям на беларускай этнічнай тэрыторыі [2, с. 142-145]. Аўтар паспрабаваў у межах сваёй працы дыферэнцыраваць іншанацыянальнае насельніцтва. У якасці вызначальнага крытэрыю даследчыкам быў абраны колькасны паказчык. Так ён вылучае "асноўныя" нацыянальныя меншасці – "жыдоў" (яўрэяў), палякаў, "маскоўцаў" (рускіх). Даследчык спыняецца і на характарыстыцы некаторых "малых" нацыянальных меншасцей – цыганах, татарах. У якасці сіноніма для вызначэння іншанацыянальнага насельніцтва аўтар ўводзіць словазлучэнне "этнаграфічная група" [2, с. 145].

У наступныя гады словазлучэнне "нацыянальная меншасць" атрымала распаўсюджанне ў публіцыстычных і навуковых творах, ў афіцыйным справаводстве і прававых актах. Заслугоўвае ўвагі імкненне беларускіх савецкіх этнографаў да выкарыстання тэрміна "этнаграфічная група" пры вывучэнні прадстаўнікоў не тытульнай нацыянальнасці [3, арк. 170]. Разам з тым дадзены падыход у навуковай літаратуры міжваеннага перыяду не замацаваўся.

Даследчыкі і аўтары публіцыстычных твораў, актыўна ўжываючы тэрмін "нацыянальная меншасць", не давалі яму цвёрда акрэсленага вызначэння. У сувязі з апошнім, у шэрагу работ падымалася пытанне якія з этнічных груп варта адносіць да нацыянальных меншасцей. Так,



Рэпазіторый ВДУ

Л. Цвяткоў у артыкуле "Некалькі слоў аб менскіх татарах" (1927 г.) [4], звярнуў увагу на тую акалічнасць, што пытанне нацыянальнай прыналежнасці беларускіх татараў з'яўляецца дыскусійным і слаба распрацаваным. Даследчык адзначыў, што татарскае насельніцтва можна разглядаць як спецыфічную рэлігійную групу беларусаў-мусульман [4, с. 17]. Аднак, навуковец у далейшым не развіваў сваю ідэю. Іншыя даследчыкі, прызнаючы культурную блізкасць беларусаў з мясцовымі татарамі, не ставілі пад пытанне факт нацыянальнай прыналежнасці апошніх.

Важнай крыніцай для разумення сэнсу тэрміна "нацыянальная меншасць" з'яўляецца зборнік "Практическое разрешение национального вопроса в БССР" (1928 г.) [5]. У прадмове да выдання старшыня Нацыянальнай камісіі пры ЦВК БССР А. Хацкевіч, канстатуючы поспехі палітыкі беларусізацыі, адзначае, што настала пара разглядаць у якасці адной з нацыянальных меншасцей рускае насельніцтва Савецкай Беларусі і праводзіць сярод яго прадстаўнікоў адмысловую работу [5, с. 4]. Тым самым, заўважна пазіцыя кіруючых органаў да вызначэння нацыянальных меншасцей – іншанацыянальная група насельніцтва, якая мае патрэбу ў правядзенні мерапрыемстваў накіраваных на задавальненне культурных патрэб на роднай мове для захавання нацыянальнай тоеснасці яе прадстаўнікоў.

Варта спыніцца і яшчэ на адным тэрміне, які актыўна ўжываўся ў працах міжваеннага перыяду прысвечаных нацыянальным меншасцям у Беларусі. Такім тэрмінам выступала "калонія" [2, с. 144]. Яго выкарыстанне характэрна пры апісанні кампактных пасяленняў іншанацыянальнага насельніцтва у сельскай мясцовасці. Таксама ён мог ўжывацца і ў больш шырокім сэнсе каб падкрэсліць перасяленчы характар пэўнай нацыянальнай меншасці (напрыклад латышы, літоўцы, эстонцы і інш.) [6]. Аднак ужо да сярэдзіны 1930-х гг. заўважны паступовы адыход ад яго выкарыстання ў літаратуры. Апошняе варта звязаць з шэрагам акалічнасцей. Па-першае, ужо ў канцы 1920-ых гг. прадстаўнікі кіраўніцтва СССР звярталі ўвагу на шкоднасць для сацыялістычнага будаўніцтва памянёнага тэрміна. Так, адзін з галоўных тэарэтыкаў нацыянальнага пытання ў СССР М. Скрыпнік ў 1929 г. наступным чынам выказваўся на конт адзначанага слова: "Трэба не толькі само слова вытравіць калёным жалезам, але і саму псіхалогію каланісцкую" [Цыт. па: 7, с. 473]. Па-другое, працэс калектывізацыі ў значнай ступені нівеліраваў адметнасці ў спосабах вядзення гаспадаркі, якія існавалі ў прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, садзейнічаў складванню эканамічнай роўнасці з прадстаўнікамі тытульнай нацыянальнасці. У сувязі з апошнім галоўная ўвага надавалася сацыяльнаму паходжанню іншанацыянальнага насельніцтва.

**Заключэнне.** На працягу міжваеннага перыяду ў працах прысвечаных іншанацыянальнаму насельніцтву Беларусі ў якасці асноўнага тэрміна замацавалася словазлучэнне "нацыянальная меншасць". Памянёны тэрмін не меў повязі з расійскай імперскай навуковай і публіцыстычнай думкай і меў больш шырокае сэнсавае значэнне. Акрамя таго, значнае распаўсюджванне ў навуковай і публіцыстычнай літаратуры атрымаў тэрмін "калонія" для вызначэння вясковага насельніцтва.


1. Инородческая школа прежде и теперь // Школа и культура Советской Белоруссии, 1919. – № 2–3. – С. 10–13.
2. Смоліч, А.А. Географія Беларусі /А.А. Смоліч. – Выд. 4-е. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993 – 405 с.
3. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6.
4. Цвяткоў, Л. Некалькі слоў аб менскіх татарах / Л. Цвяткоў // Наш край, 1927. – № 6–7. – С. 10 – 17.
5. Практическое разрешение национального вопроса в БССР. – Ч. 2 : Работа среди национальных меньшинств в БССР. – Минск : Изд. Нацкам. ЦВК БССР, 1928. – 159 с.
6. Шкільтэр, К.Ю. Латыскія колёніі на Беларусі. Гістарычнае разьвіцьцё латыскіх сялянскіх гаспадарак. / К. Ю. Шкільтэр. – Менск : Беларуская акадэмія навук, 1931. – 271 с.
7. Дённингхаус, В. В тени "Большого Брата" : Западные национальные меньшинства в СССР (1917 – 1938 гг.) / В. Дённингхаус. – Москва : РОССПЭН, 2011. – 727 с.


## ВІЦЕБСКІЯ ГУБЕРНАТАРЫ І АСВЕТА Ў 1860–1890-Я ГГ.


*Я.М. Ляпешкін*
*Мінск, БДУ*


Вышэйшымі прадстаўнікамі губернскай адміністрацыі з'яўляліся губернатары. Яны рэалізоўвалі палітыку цэнтра на лакальным узроўні, але характар яе ажыццяўлення залежыў ад іх асабістых якасцяў. Даследаванне гэтай катэгорыі чыноўнікаў уяўляецца актуальным, бо



Рэпазіторый ВДУ